**Каляндар знамянальных і памятных дат на 2020 год**

Год малой радзімы ў Беларусі

Год 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гадоў

890 гадоў з дня нараджэння Кірылы Тураўскага (каля 1130 ці 1113) – пісьменніка-прапаведніка

780 гадоў з часу ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага (1249 – 1795), усходнееўрапейскай дзяржавы, якая існавала на тэрыторыі

сучаснай Беларусі і Літвы, а таксама часткова Украіны, Расіі,

Латвіі, Польшчы, Эстоніі і Малдовы

550 гадоў з дня нараджэння Міколы Гусоўскага (1470-я – 1533?, Вільня, Польшча, Італія)[1] – беларускага і польскага паэта-гуманіста

530 гадоў з дня нараджэння Францыска Скарыны (каля 1490 – 1551?, Полацк, Польшча, Літва, Чэхія, Прусія, Італія) – першадрукара, пісьменніка

510 гадоў з дня нараджэння Івана Фёдарава (каля 1510 – 1583) –

асветніка, заснавальніка кнігадрукавання ў Расіі і Украіне

500 гадоў з часу заснавання Ф. Скарынам Віленскай друкарні,

першай ва усходніх славян (пачатак 1520-х)

490 гадоў з дня нараджэння Сымона Буднага (каля 1530, Польшча, Літва) –

дзеяча беларускай культуры

470 гадоў з дня нараджэння Лаўрэнція Зізанія (1550-я ці 1560-я) – беларускага і ўкраінскага педагога, паэта, мовазнаўца, перакладчыка

460 гадоў з дня нараджэння Саламона Рысінскага (каля 1560) –

польскага і беларускага паэта-лацініста, педагога, фальклярыста

420 гадоў з дня нараджэння Казіміра Семяновіча (каля 1600 – пасля 1651, Літва, Нідэрланды, Расія, Польшча), інжынера і тэарэтыка артылерыі, мысліцеля-гуманіста

290 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Казіміра Агінскага (1730-1800) – кампазітара, пісьменніка, мецэната; па яго сродкі пабудаваны Агінскі канал, якому спаўняецца 255 гадоў з пачатку будаўніцтва

230 гадоў з дня нараджэння Яна Баршчэўскага (1790 ці інш., Расонскі раён, Расія, Польшча, Украіна) – пісьменніка, фальклярыста

**Студзень**

7 студзеня – Божае Нараджэнне (па календары праваслаўнай канфесіі)

[1] У дужках падаецца год і месца нараджэння (калі вядома), краіна пражывання, дзейнасці асобы

9 студзеня – 150 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Пшчолкі (1870, Ушацкі раён, Эстонія), пісьменніка, публіцыста, этнографа, фальклярыста

10 студзеня – 220 гадоў з дня нараджэння Адама Сузіна (1800, Кобрынскі пав., Польшча, Расія, Казахстан, Украіна, Літва), удзельніка нацыянальна-вызваленчага руху, падарожніка, сакратара Зялёнага саюза Таварыства філарэтаў

23 студзеня – 100 гадоў з дня нараджэння Пятра Данелія (1920, Дагестан), жывапісца

24 студзеня – 135 гадоў з дня нараджэння Юрыя Тарыча (1885, Полацк, Расія, Манголія), беларускага і расійскага кінарэжысёра, сцэнарыста, заснавальніка беларускага кіно, заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі

26 студзеня (апошняя нядзеля ст.) – Дзень беларускай навукі

**Люты**

2 лютага – 85 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Валынца (1935, Пінскі раён), вучонага ў галіне ізіялогіі і біяхіміі раслін, лаўрэата прэміі акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы, прэміі НАН Беларусі

5 лютага – 90 гадоў з дня нараджэння Расціслава Янкоўскага (1930, Адэса, Расія, Беларусь), акцёра тэатра і кіно, народнага артыста Беларусі і СССР

16 лютага – 95 гадоў з дня нараджэння Івана Навуменкі – народнага пісьменніка Беларусі

19 лютага – 105 гадоў з дня нараджэння Анатоля Бярозкі (1915, Ляхавіцкі раён), паэта, культурнага і грамадскага дзеяча беларускага замежжа (ЗША), заслужанага доктара медыцыны

19 лютага – 130 гадоў з дня нараджэння Казіміра Сваяка (1890, Астравецкі раён, Літва), паэта, празаіка, рэлігійнага і грамадскага дзеяча

21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы

23 лютага – Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь

24 лютага – 85 гадоў з дня нараджэння (1935) Рыгора Барадуліна – народнага паэта Беларусі

**Сакавік**

8 сакавіка – Дзень жанчын

8 сакавіка – 110 гадоў з дня нараджэння Пётры Конюха – сусветнавядомага опернага спевака, педагога, («беларускі Шаляпін», 1910, Карэліцкі раён, Італія, ЗША)

15 сакавіка – 170 гадоў з дня нараджэння Войслава Казіміра Савіч-Заблоцкага (1850 ці 1849, Міёрскі раён, Польшча), беларускага і польскага пісьменніка, паэта, публіцыста

15 сакавіка – 90 гадоў з дня нараджэння Жарэса Алфёрава (1930, Віцебск, Расія), расійскага вучонага-фізіка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі

21 сакавіка – 180 гадоў з дня нараджэння Францішка Бенядзікта Багушэвіча (1840, Гродзенская вобл., Літва, Расія, Украіна), пісьменніка, публіцыста, перакладчыка, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры (крытычны рэалізм)

27 сакавіка – Міжнародны дзень тэатра

31 сакавіка – 220 гадоў з дня нараджэння Восіпа Сянкоўскага (1800, Віленскі павет), вучонага-ўсходазнаўца, дыпламата, пісьменніка, мовазнаўца, журналіста, члена-карэспандэнта Пецярбургскай АН

**Красавік**

2 красавіка – Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі

12 красавіка - Вялікдзень (па календары каталіцкай канфесіі)

15 красавіка – Міжнародны дзень культуры

19 красавіка – Вялікдзень (па календары праваслаўнай канфесіі)

28 красавіка – Радаўніца (дзень памяці памерлых па календары праваслаўнай канфесіі)

**Май**

1 мая – Свята працы

1 мая – 125 гадоў з дня нараджэння Уладзіслава Паўлюкоўскага (1895, Стаўбцоўскі раён, Украіна, Літва, Польшча), пісьменніка, перакладчыка, этнографа

3 мая – 400 гадоў з дня нараджэння Багуслава Радзівіла (1620), ваеннага і дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, паэта, мастака, мецэната

6 мая – 100 гадоў з дня нараджэння Анатоля Логінава (1920), акцёра, народнага артыста Беларусі, заслужанага артыста Літвы

9 мая – Дзень Перамогі

10 мая – Дзень Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь

12 мая – 220 гадоў з дня нараджэння Валенція Ваньковіча (1800, Бярэзінскі раён, Літва, Расія, Германія, Францыя)

13 мая – 85 гадоў з дня нараджэння Альберта Багдасарава (1935, Узбекістан), вучонага-геолага, інжынера, спартсмена (футбол), выдатніка адукацыі Беларусі

15 мая – 175 гадоў з дня нараджэння Яна Чэрскага (1845, Дрысенскі павет, Літва, Расія), даследчыка Сібіры, удзельніка паўстання 1863-1864 гадоў

18 мая – 80 гадоў з дня нараджэння Яна Чыквіна (1940, Беластоцкая вобл, Польшча), паэта, перакладчыка, літаратуразнаўца, даследчыка

24 мая – Дзень славянскага пісьменства і культуры

**Чэрвень**

5 чэрвеня – Дзень памяці святой Еўфрасінні Полацкай

14 чэрвеня – 120 гадоў з дня нараджэння Міхася Забэйды-Суміцкага (1900, Пружанскі раён, Расія, Кітай, Італія, Польшча, Чэхія), опернага спевака, педагога

22 чэрвеня – Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны

24 чэрвеня – 120 гадоў з дня нараджэння Кузьмы Чорнага (1900, Капыльскі раён), пісьменніка, перакладчыка

**Ліпень**

3 ліпеня – Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі)

10 ліпеня – 120 гадоў з дня нараджэння Пётры Сергіевіча (1900, Браслаўскі раён), беларускага і літоўскага мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў Літвы

15 ліпеня – 120 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Дубоўкі (1900 ці 1901, Пастаўскі раён, Расія), паэта, празаіка, перакладчыка, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы

24 ліпеня – 200 гадоў з дня нараджэння Люцыяна Крашэўскага (1820, Пружаны, Эстонія, Расія, Польшча), мастака, фатографа

25 ліпеня – 180 гадоў з дня нараджэння Юльяна Крачкоўскага (1840, Жабінкаўскі раён, Расія, Літва), беларускага фальклярыста, этнографа, гісторыка, археографа, педагога

**Жнівень**

6 жніўня – 180 гадоў з дня нараджэння Альгерда Абуховіча (1840, Глускі раён, Швейцарыя, Францыя), паэта, мемуарыста, перакладчыка, аднаго з пачынальнікаў жанру байкі ў беларускай літаратуры

**Верасень**

1 верасня – Дзень ведаў

1 верасня – 185 гадоў з дня нараджэння Юзафа Каліноўскага (1835, Вільня, Літва), удзельніка паўстання 1863– 1864 гг., мемуарыста, рэлігійнага дзеяча, святога Рымска-каталіцкай Царквы

6 верасня – Дзень беларускага пісьменства

13 верасня – 145 гадоў з дня нараджэння Сяргея Паўловіча (1875, Драгічынскі раён, Украіна, Літва), беларускага грамадска-культурнага і рэлігійнага дзеяча, педагога, які адыграў значную ролю ў пашырэнні пісьменнасці, асветы на роднай мове ў Заходняй Беларусі, аднаго з кіраўнікоў Таварыства беларускай школы

20 верасня – 210 гадоў з дня нараджэння Плакіда Янкоўскага (1810, Камянецкі раён, Польшча), беларускага і польскага пісьменніка-празаіка, паэта, публіцыста, перакладчыка, педагога, царкоўнага дзеяча, магістра тэалогіі

29 верасня – 140 гадоў з дня нараджэння Сяргея Сахарава (1880, Полацк, Эстонія, Латвія), беларускага фальклярыста, этнографа

**Кастрычнік**

1 кастрычніка – Міжнародны дзень музыкі

7 кастрычніка – 255 гадоў з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага (1765, Польшча, Беларусь, Галандыя, Англія, Прусія, Аўстрыя, Італія, Францыя), дзяржаўнага дзеяча Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, дыпламата, кампазітара, літаратара, удзельніка паўстання 1794 года

11 кастрычніка – Дзень работнікаў культуры

14 кастрычніка – Дзень маці

26 кастрычніка – 210 гадоў з дня нараджэння Генрыка Дмахоўскага (1810, Вільня ці Міёрскі раён, Францыя, Аўстрыя, Літва), скульптара, удзельніка рэвалюцыйнага руху на Беларусі, у Літве і Польшчы ў 1830–1860-я гады

28 кастрычніка – 175 гадоў з дня нараджэння Зыгмунта Фларэнты Урублеўскага (1845, Гродна), польскага вучонага-фізіка, педагога, аднаго з заснавальнікаў фізікі нізкіх тэмператур, члена-карэспандэнта АН у Кракаве (Польшча), удзельніка паўстання 1863–1864 гадоў

**Лістапад**

2 лістапада – Дзень памяці, Усіх памерлых, Дзяды (па календары каталіцкай і праваслаўнай канфесіі)

2 лістапада – 90 гадоў з дня нараджэння Алеся Баршчэўскага (1930, Беластоцкае ваяводства), паэта, літаратуразнаўца, публіцыста, перакладчыка, фальклярыста, педагога, грамадска-культурнага дзеяча, кавалера ордэна Ф. Скарыны

11 лістапада – 145 гадоў з дня нараджэння Альберта Паўловіча (1875, Мінск, Расія), паэта, драматурга

12 лістапада – 100 гадоў з дня нараджэння Андрэя Макаёнка (1920, Рагачоўскі раён), драматурга, народнага пісьменніка Беларусі

26 лістапада – 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча (1930, Орша, Украіна), пісьменніка, перакладчыка, крытыка

27 лістапада – 120 гадоў з дня нараджэння Рыгора Пукста (1900, Гомель, Расія), кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, аўтара першай беларускай оперы для дзяцей «Марынка»

**Снежань**

6 снежня – 220 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Ходзькі (1800, Вілейскі павет, Літва, Расія, Грузія), ваеннага геадэзіста, генерал-лейтэнанта, падарожніка, ганаровага члена Рускага геаграфічнага таварыства

10 снежня – 150 гадоў з дня нараджэння Фердынанда Рушчыца (1870, Валожынскі раён, Польшча, Літва), жывапісца, графіка, тэатральнага дэкаратара і педагога

17 снежня – Дзень беларускага кіно

20 снежня – 180 гадоў з дня нараджэння Казіміра Альхімовіча (1840, Шчучынскі раён), жывапісца, графіка, творчасць якога звязана з мастацкім жыццём Польшчы, Беларусі і Літвы, аўтара гістарычных палотнаў і серыі карцін па матывах творчасці А. Міцкевіча

21 снежня – 130 гадоў з дня нараджэння Мікалая Аладава (1890, Санкт-Пецярбург, Расія, Беларусь), кампазітара, педагога, аднаго з арганізатараў Беларускага музычнага тэхнікума і кансерваторыі (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі), народнага артыста Беларусі

25 снежня – Божае Нараджэнне (па календары каталіцкай канфесіі)